**«Радзіма мая Беларусь у асобах. З клопатам аб здароўі”**

**25.04.2024**

На першым этапе ШАГа актуалізаваліся веды пра сістэму аховы здароўя Рэспублікі Беларусь з дапамогай інтэрактыўнай віктарыны “Мы пазнаём”, якая дазволіла вучням актыўна праявіць сябе, у тым ліку выкарыстоўваючы веды, набытыя пад час мерапрыемстваў праекта “ШАГ”. У ходзе віктарыны вучні даведаліся пра ўстановы адукацыі, якія рыхтуюць спецыялістаў для аховы здароўя, пра дасягненні ў вобласці медыцыны, якімі могуць ганарыцца беларусы, чаму Беларусь выбіраюць пляцоўкай не толькі для лячэння і аздараўлення, але і для атрымання медыцынскай адукацыі, якімі якасцямі павінен валодаць медыцынскі работнік.

На другім этапе перад вучнямі выступіла фельчар Ленінскага ФАПа Зайцава Мая Леанідаўна.



Зайцава Мая Леанідаўна нарадзілася ў 1967 годзе ў вёсцы Свяцілавічы Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыла 10 класаў Свяцілкавіцкай СШ. У 1984 годзе паступіла ў Гомельскае медыцынскае вучылішча, якое закончыла ў 1986 годзе. Пасля была накіравана на адпрацоўку ў Свяцілкавіцкую ўчастковую бальніцу. 1989 год – Добрушская ЦРБ, 1992 – Завідаўскі ФАП, 1995 – Ленінскі ФАП. Працоўны стаж- 38 гадоў.

Дадзены этап быў праведзены з выкарыстаннем фармата тэлевізійнага праекта “100 пытанняў дарасламу”. Мая Леанідаўна расказала пра сябе (кім працуе, як доўга працуе ў гэтай прафесіі), чаму выбрала гэту прафесію, што больш за ўсё падабаецца ў прафесіі медыцынскага работніка, з якімі цяжкасцямі сутыкаецца ў сваёй рабоце, успомніла свайго першага пацыента, што робіць для павышэння свайго прафесійнага ўзроўню, звярнула ўвагу на якасці, якімі павінен валодаць медыцынскі работнік. Вучні даведаліся пра запатрабаваныя прафесіі ў вобласці медыцыны, пра перспектывы развіцця аховы здароўя.




Пры падвядзенні вынікаў быў зроблены акцэнт на актуальнасці дадзенай тэмы, вучні растлумачылі сутнасць прапанаванага меркавання: “Здоровье – это не

подарок, который человек получает один раз и на всю жизнь, а результат сознательного поведения каждого человека и всех в обществе” (А.С.Макаренко).